# АБАГУЛЬНЯЮЧЫ ЎРОК ПА ТЭМЕ “ ЗА СМУГОЮ СТАГОДДЗЯЎ”. 5 КЛАС

**Машканава Святлана Аляксандраўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
ДУА “ Суражская сярэдняя школа
імя Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова ”

***Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына…***

*Дадзеная метадычная распрацоўка прызначана для абагульняючага ўрока ў пятых класах па тэме “За смугою стагоддзяў”. Яна дапамагае найбольш поўна раскрыць прыгажосць вуснай народнай творчасці, якая невычэрпнай крыніцай сілкуе нашу мову, літаратуру і наша жыццё.*

**Тэма:** Абагульняючы ўрок па тэме “За смугою стагоддзяў”.

**Мэта:** садзейнічаць абагульненню і сістэматызацыі ведаў вучняў па тэме “За смугою стагоддзяў”.

**Задачы:** замацаваць і прывесці ў сістэму набытыя пяцікласнікамі веды пра фальклор і яго жанры; садзейнічаць развіццю маўлення вучняў, папаўняць іх слоўнікавы запас; спрыяць выхаванню павагі да народнай спадчыны, пачуцця нацыянальнай годнасці і гонару за свой народ.

**Форма**: урок-абагульненне.

**Вучэбна-метадычнае забеспячэнне:** падручнік, карткі з заданнямі, малюнкі вучняў, выстава кніг (казкі, загадкі, прыказкі), дрэва “Фальклор”.

**Тып урока:** абагульненне і сістэматызацыя ведаў.

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына,
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай…

*Я. Купала “Спадчына”*

**Ход урока:**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны момант**

Уступнае слова настаўніка:

На дошцы запісаны словы Янкі Купалы з верша “Спадчына”.

— Пра што мы сёння на ўроку будзем гаварыць? Што нам у спадчыну засталося ад прадзедаў?

— З маленства і назаўжды ўваходзіць у наша жыццё народная паэзія. Спачатку нас прываблівае мілагучная калыханка, пасля мы захапляемся цікавымі дзівоснымі казкамі, здзіўляемся мудрасці і паэтычнаму хараству прыказак, прымавак і загадак. З легендаў паўстае перад намі мінулае нашага народа, роднай Беларусі. Вусная народная творчасць, як невычэрпная крыніца, сілкуе нашу мову і літаратуру, наша жыццё.

Цудоўнаму народнаму мастацтву і майстэрству мы і прысвячаем сённяшні ўрок.

**ІІ.Этап актуалізацыі раней вывучанага**

**1. Лічбавы дыктант**

Калі згодны са сцвярджэннем, то ставім 1, калі не — 0.

1) Іншая назва вуснай народнай творчасці — фальклор.

2) Міфы, легенды, паданні, казкі, песні, загадкі, прыказкі, прымаўкі, прыкметы і павер’і можна аднесці да фальклору.

3) Аўтарам фальклорных твораў з’яўляецца пісьменнік.

4) Казка — вуснае мастацкае апавяданне з элементамі выдумкі і фантазіі.

5) Прыказка — гэта трапнае народнае выслоўе з павучальным зместам.

6) Прыкметы — народныя выслоўі, у якіх людзі асвятлялі невядомы факт, грунтуючыся не на жыццёвым вопыце, а на выдумцы, фантазіі чалавека, часам нават на містыцы.

7) Павер’і — гэта трапныя народныя выслоўі, у якіх выказваецца пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам.

8) Легенды — фальклорныя фантастычныя апавяданні, заснаваныя на паэтызацыі гістарычных падзей і ўслаўленні народных герояў.

9) Вусная народная творчасць перадавалася з пакалення ў пакаленне.

Адказы:
1. 1
2. 1
3. 0
4. 1
5. 1
6. 0
7. 0
8. 1
9. 1

**2. Казкі**

Пазнайце казку па эпізодзе:

1. “ Нічога не ўзяў Іван з сабой: ні грошай, ні хлеба. Толькі ўзяў трэцяе пяро, кій у рукі і ножык-сцізорык, той, якім лучынкі стругаў. І пайшоў пехатою залатога птаха шукаць”. (*“Залаты птах”*)

2. “ – Ну што: адгадалі мае загадкі? – пытаецца пан.

Багаты выйшаў наперад:

— Ды тут і адгадваць няма чаго: нікога і нічога на свеце няма сыцей за майго рабога парсучка, саладзей за ліпавы мёд ад маіх пчол і шпарчэй за майго гнедага жарабца”. (*“Разумная дачка”*)

3. Аднавіце кампазіцыю казкі “Залаты птах”, паставіўшы правільна нумары частак (групавая форма работы)

А. Аж бачыць — ляціць да яблыні вялікі залаты птах.

Б. Прынёс Іван дзве жардзіны сукаватыя, апусціў у яму.

В. Цешыцца бацька з яблыкаў, і сыны цешацца.

Г. Бачыць Іван — стаіць на беразе мора залаты палац.

Д. Адзін хлопец у мяне за памочніка быў, дык ён і наварыў такіх смачных страў.

Е. Пабегла ваўчыха на высокую гару, дастала пляшачку жывой вады.

Адказы:
1. В
2. А
3. Б
4. Г
5. Е
6. Д

**3. Загадкі**

У народзе кажуць: загадка — розуму зарадка. Мы сёння з вамі паспрабуем выявіць, хто больш назіральны, кемлівы, хто ўмее лепш разважаць, думаць.

1. Адзін гаворыць, абодва глядзяць ды абодва слухаюць. (*язык, вочы, вушы*)

2. Не рыба, а плыве, не конь, а ходзіць, не піла, а рэжа. (*бабёр*)

3. Вышэй за ўсіх стаіць, навокал глядзіць, люльку курыць. (*комін*)

4. Брат з братам цераз дарогу жывуць, адзін другога не бачаць. (*вочы*)

5. Пяцёра братоў, гадамі роўныя, а ростам розныя. (*пальцы*)

**4. Легенды**

Якія легенды вы вывучалі на ўроках? (“Нарач”, “Пестунь”). Адкуль пайшла назва пасёлка Сураж? Раскажыце легенду пра Суражскі замак.

1. Замак… Гэта месца трохвугольным клінам уразаецца ў Заходнюю Дзвіну.

Усё, пра што расказвае легенда, было ў тыя далёкія гадзіны, калі Сураж належаў Вялікаму княству Літоўскаму. Адзін з князёў, што правіў на гэтых землях, вельмі любіў паляваць у суражскіх лясах. Яму падабалася гэта месца, шчодра адоранае прыродай: рака з яе чыстымі і плаўнымі водамі, берагі, упрыгожаныя вербамі і квітнеючай чаромхай, непраходныя лясы, а людзі адрозніваліся дабрынёй і працавітасцю.

Але больш за ўсё яму падабаліся тутэйшыя дзяўчыны, прыгожыя, вясёлыя, зграбныя, звонкія пявунні. У сваіх светлых, расшытых вопратках былі яны падобны на маладыя, стромкія бярозкі, якія знаходзіліся вакол і радавалі ўсіх сваёй чысцінёй.

Пра ўсе гэта князь расказваў сваёй дачцэ, а потым узяў яе з сабой паглядзець гэтыя мясціны. Княжацкай дачцэ спадабалася не толькі наваколле, але і добры хлопец, зграбны ды прыгожы. Пакахала княжна тутэйшага рыбака ўсёй душой, усім сваім дзявочым сэрцам. Ніхто і нічым не мог згасіць гэтае яркае і гарачае каханне.

І вырашыла княжна застацца жыць у гэтым краі. Аднак калі князь даведаўся аб гэтым, то вельмі раззлаваўся на непакорлівую дачку і загадаў змайстраваць на стыку дзвюх рэк вялікі замак і пасадзіць у яго непакорлівую прыгажуню.

Ішлі гады. Княжна не змагла адмовіцца ад свайго кахання, пралівала горкія слёзы, усё глядзела на раку і чакала, ці з’явіцца лодка з добрым хлопцам. Ад яе горкіх слёз пачаў рушыцца высокі бераг, замак споўз у раку, а потым рухнуў разам са сваёй святліцай.

2. Ёсць яшчэ версія. Калісьці праз мястэчка, дзе зараз знаходзіцца Сураж, ехала царыца Кацярына II. У той час тут было некалькі хат. Так здарылася, што Кацярына са світай засталася тут начаваць. А раніцай у мясцовых жыхароў спытала, як называецца гэта мястэчка. Яны адказалі, што ніяк. І тады яна загадала суправаджаючым суражацца (г. зн. збірацца ехаць далей) і дадала: “Няхай гэта месца будзе Суражам”.

Вядома, на абсалютную праўдзівасць гэта версія не прэтэндуе, але менавіта так перадавалася яна з вуснаў у вусны далёкімі продкамі.

**Фізкультхвілінка**

Устаньце, калі ласка, узніміце рукі ўверх, заплюшчыце вочы і ўявіце, што вы дрэвы. Назавіце, якія дрэвы вы ведаеце? (бяроза, рабі-

на, вольха, ліпа, дуб, клён, граб, ясень). Раптам падзьмуў лёгкі ветрык і дрэвы захісталіся (вучні нахіляюцца ўлева, управа, уперад, назад). Вецер усё мацнеў і мацнеў, пачалася бура! Нечакана вецер сціх, пайшоў ціхі цёплы дожджык. Дрэвы падставілі яму свае твары, потым лёгка абтрэслі кропелькі дажджу са сваіх галінак і супакоіліся.

**5. Прыказкі**

Завяршыце прыказкі, падабраўшы адпаведную канцоўку з падказак.

Як гукнеш, … а спраў на вяршок
Згода будуе, … а той, хто дае
З вялікага грому … то забудзецца ўстаць
Як ляжа спаць, … нязгода руйнуе
Слоў мяшок, … так і адгукнецца
Не той багаты, хто мае, … малы дождж

***Адказы:***

1. Як гукнеш, так і адгукнецца.
2. Згода будуе, нязгода руйнуе.
3. З вялікага грому — малы дождж.
4. Як ляжа спаць, то забудзецца ўстаць.
5. Слоў мяшок, а спраў на вяршок.
6. Не той багаты, хто мае, а той, хто дае.

**6. Прыкметы і павер'і**

Раскажыце, што будзе згодна з гэтымі прыкметамі адпаведна народным назіранням.

1. Сонца ў хмарку садзіцца — … ( будзе дождж)
2. Зорная купальская ноч — … (на добры ўраджай грыбоў)
3. Бяроза дае многа соку — … (да мокрага лета)
4. Увечары трашчаць конікі — …(на добрае надвор'е)
5. Сей смела, калі ў садзе … (бела.)
6. Ноч без расы — … (дзень з дажджом.)

**III. Кантрольна-рэфлексійны этап**

Тэст па казцы “Разумная дачка”

1. “Разумная дачка” — гэта казка:
А) аўтарам якой з'яўляецца В. Вітка;
Б) руская народная;
В) бытавая.

2. Разумная дачка з казкі мела ўзрост:
А) 9 год;
Б) 6 год;
В) 7 год.

3. Бядняк пайшоў па ваду, у кустах знайшоў кволую(-ага), слабую(-ога):
А) цялушку;
Б) казу;
В) каня.

4. Бядняк знайшоў знаходку тады, калі збіраўся спраўляць (адзначаць):
А) Новы год;
Б) Вялікдзень;
В) свой дзень нараджэння.

5. Каб рассудзіць бедняка і багача, пан першы раз загадаў:
А) пяць загадак;
Б) чатыры загадкі;
В) тры загадкі.

6. Багатаму суседу разгадаць загадкі дапамог (дапамагла):
А) суседка;
Б) жонка;
В) дачка.

7. Кросны, пра якія ўспамінае дачка пры разгадванні другой загадкі, — гэта:
А) назва мясцовасці;
Б) назва маёнтка пана;
В) ручны ткацкі станок.

8. Што на свеце сыцей (тлусцей, таўсцей) за ўсё? На гэту загадку багаты сусед адказаў:
А) зямля;
Б) гарбузы ў агародзе;
В) рабы парсюк.

9. Разгадаўшы ўсе загадкі пана, дзяўчынка засталася ў яго за:
А) прыёмную дачку;
Б) служанку (пакаёўку);
В) лекара.

АДКАЗЫ

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | |

1. В
2. А
3. В
4. В
5. Б
6. В
7. В
8. А
9. А

Вучні працягваюць фразу “ Я сабе паставіла б (паставіў бы) … , таму што …

**IV. Дамашняе заданне (на выбар)**

1. Падабраць і запісаць у сшытку некалькі прыказак, у якіх высмейваецца гультайства і лянота.
2. Паспрабаваць прыдумаць казку. (9–10 балаў)